# ГІСТОРЫЯ

УДК 930 (ИБеи)+357.71

*І.І. Шаўчук*

## ХАРАКТАРЫСТЫКА НАЦЫЯНАЛЬНАГА СКЛАДУ ВУЧОНЫХ (1920–1930-я гады)

У артыкуле на падставе вывучэння апублікаваных даследаванняў і архіўных матэрыялаў прадпрынята спроба прааналізаваць дынаміку зменаў у нацыянальным складзе вучоных Беларусі ў міжваеннае дваццацігоддзе. Пры гэтым упершыню ўвага сканцэнтравана на гуманітарыях. Праблема разглядаецца ва ўзаемасувязі і ўзаемаабумоўленасці грамадска-палітычнай сітуацыі і ўласна навуковай. Разам з тым падкрэсліваецца вырашальная роля партыйна-ўрадавых рашэнняў у справе рэгулявання нацыянальнага складу вучоных, яго залежнасць ад змены скіраванасці курса палітыкі партыі ў сацыяльна-эканамічнай сферы, што ў першую чаргу адбівалася менавіта на прадстаўніках гуманітарных навук.

Нацыянальны склад вучоных у беларускай гістарыяграфіі разглядаўся ў шэрагу манаграфічных прац У. Міхнюком [1], Я. Новікам [2], Г. Карзенкам [3] і інш. Некаторая ўвага нададзена акрэсленаму пытанню ў абагульняльных працах па гісторыі Беларусі [4]. У дадзеным выпадку мы сканцэнтруем сваю ўвагу на аналізе нацыянальнага складу гуманітарыяў, спроба чаго ў айчыннай літаратуры не прадпрымалася.

Як вядома, у Беларусі з пачатку 1920-х гадоў ставілася мэта стварэння менавіта нацыянальнай беларускай адукацыі і навукі. Спрыяла здзяйсненню такіх жаданняў выпрацоўка нацыянальнай палітыкі рашэннямі X (сакавік 1921 г.) і XII (красавік 1923 г.) з’ездаў РКП(б). Яны ўзялі курс на ліквідацыю фактычнай няроўнасці народаў СССР ва ўсіх галінах грамадска-палітычнага, культурнага і эканамічнага жыцця. З ліпеня 1924 г. на практычныя рэйкі ставіцца ажыццяўленне дэкларavанай нацыянальнай палітыкі, якая атрымала ў БССР назвы “беларусізацыя” і “каранізацыя”. Яе галоўныя прынцыпы экстрапаляваліся і на навуковую сферу. Разам з тым, трэба памятаць, што найбольш выбітныя вучоныя прыехалі ў БССР пераважна з РСФСР. Яны ў асноўнай сваёй масе, па нашым меркаванні, не ўяўлялі Беларусь асобнай краінай, не аддзялялі яе ад Расіі, маючы на ўвазе толькі нязначныя этнаграфічныя асаблівасці. Таму, відавочна, не выказвалі сур’ёзных адносін да беларусізацыі. Многія лічылі яе справай непатрэбнай. У выніку камуністычная фракцыя праўлення БДУ фіксавала ў кастрычніку 1926 г.: “Пераважалі русіфікатарскія настроі, абапіраючыяся на пераважна рускі склад навуковых работнікаў сярод прафесуры” [5, арк. 348]. Разам з расійскім у Беларусі дзейнічаў яшчэ адзін нацыянальны фактар – яўрэйскі, які пры слабасці беларускага часам нават дамінаваў над ім у навукова-кадравым аспекце. Спробы больш актыўнага ажыццяўлення беларусізацыі выклікалі, як адзначалася ў цытаваным дакуменце, арганізаваны сумесны адпор з боку рускіх і яўрэйскіх навуковых работнікаў.

У снежні 1923 г. у ВНУ рэспублікі выкладчыкі былі прадстаўлены 21 беларусам (22,1%), 28 яўрэямі (29,5%), 43 рускімі (45,3%) і трыма асобамі іншых нацыянальнасцяў (3,1%). Дарэчы, пры зніжэнні статуса навучальнай установы у ёй адпаведна павялічвалася колькасць выкладчыкаў беларусаў пры значным памяншэнні іншых нацыянальных груп. У сферы прафесійна-тэхнічнай адукацыі настаўнікам з карэннага этнасу належала 163 месцы (47,4%), яўрэям – 115 (33,4%), рускім – 27 (7,8%), іншым – 39 (11,4%) [6, арк. 120–121]. На працягу 1920-х ды і ў 1930-х гадах, адбываюцца пэўныя змены ў бок павелічэння беларускага прадстаўніцтва, хаця падзел

выкладчыкаў на нацыянальныя групы па колькасці і іх адпаведнасці кваліфікацыйным узроўням практычна не мяняецца, калі не лічыць нязначных карэктываў [7, арк. 110; 8, арк. 13]:

Табліца 1 – Нацыянальны склад выкладчыкаў ВНУ БССР

| Год | 1926/27 нав.год | | | 1927/28 нав.год | | | 1928/29 нав. год | | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| Нац-ць / Пасада | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Беларусы | Яўрэі | Рускія |
| Прафесары | 7 | 10 | 59 | 8 | 10 | 66 | 8 | 12 | 59 |
| % | 8,2 | 116 | 68,6 | 8,6 | 10,7 | 71 | 9 | 13,3 | 65,6 |
| Дацэнты | 23 | 13 | 35 | 29 | 20 | 41 | 23 | 19 | 41 |
| % | 30 | 17 | 46 | 31,2 | 21,5 | 44,1 | 26 | 21,3 | 46 |
| Асістэнты | 61 | 47 | 39 | 59 | 31 | 32 | 68 | 28 | 37 |
| % | 40,1 | 30,9 | 25,7 | 46,4 | 24,4 | 25,2 | 47 | 19,4 | 26 |

У БДУ – універсітэт мы выдзяляем таму, што ў ім канцэнтравалася асноўная колькасць спецыялістаў па гуманітарных навуках, – агульны лік супрацоўнікаў размяркоўваўся па нацыянальнасці наступным чынам [7, арк. 110]:

Табліца 2 – Нацыянальны склад выкладчыкаў БДУ у 1925/26 нав. годзе

| Нац-ць / Пасада | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Іншыя | Усяго | Ведаюць бел. мову |
|---|---|---|---|---|---|---|
| Прафесары | 3 | 8 | 25 | 4 | 40 | 4 |
| Дацэнты і выкладчыкі | 12 | 14 | 9 | 5 | 40 | 12 |
| Асістэнты | 26 | 40 | 19 | 4 | 89 | 19 |
| Усяго | 41 | 62 | 53 | 13 | 169 | 35 |

Як вынікае з табліцы, беларусы складалі толькі 24% агульнай колькасці выкладчыкаў універсітэта, яўрэі – 37%, рускія – 31%. У найбольш кваліфікаванай групе прафесараў рускія абсалютна дамінавалі – 62,5%. Паводле іншай справадачы, прыведзеныя лічбы выглядаюць інакш – адпаведна 25,1%, 42,5% і 25,6%, але супадаюць па ўдзельнай вазе тых, хто праводзіў заняткі на беларускай мове. Як паведамлялася, у параўнанні з 1924/25 навучальным годам колькасць беларусаў узрасла на 32,8%, рускіх – на 17,9%, яўрэяў – на 35,8% [7, арк. 104–105]. Беларускай мовай валодалі толькі 20,7%, а лекцыі чыталі на ёй 16,4% навукоўцаў. Пэўныя зрухі былі відавочнымі ў параўнанні з першым навучальным годам, калі па-беларуску выкладалі толькі У. Ігнатоўскі, Я. Лёсік і М. Піятуховіч [9, с. 58].

Зразумела, большасць з тых, хто выкладаў па беларуску, была беларусамі. Адсюль можна зрабіць выснову аб правядзенні беларусізацыі галоўным чынам асістэнтамі, выкладчыкамі і дацэнтамі, хаця не ўсе асобы беларускага паходжання валодалі беларускай мовай. Дзеля справядлівасці адзначым: на педагагічным факультэце, пераважная большасць унутранай дакументацыі, пратаколы пасяджэнняў дэканата, рады факультэта, прадметных камісій складзеныя на рускай мове. Паступова з дапамогай адміністратыўных захадаў доля беларусаў хаця і нязначна, павялічваецца: у 1926/27 навучальным годзе яны складалі ўжо 35% [10, арк. 89 адв.].

Сярод шэрагу такіх захадаў выклікае цікавасць ініцыятыва прафесарскага сходу БДУ, які пастанавіў, а праўленне зацвердзіла абавязковую неабходнасць чытання

лекцый па беларуску для атрымання дацэнцкай пасады. Прычым утрымацца на ёй можна было толькі пры той самай умове. Пры пераходзе на рускую мову лектар павіне пазбаўл адпаведнай пасады [11, арк. 120]. Праўда, фіксаваліся спробы абысці такое патрабаванне. Так, Нацкамісія ЦВК у лютым 1931 г. прыводзіла прыклад дацэнта Друскоўскага, які адным з матываў атрымання пасады выставіў пераход на беларускую мову выкладання, а пасля заявіў, “што за зіму ён вывучае, за лета забывае; даказваў, што ён арганічна не можа вывучыць беларускую мову, бо ён не беларус.“ У сваіх адносінах да беларусізацыі яму было з каго браць прыклад. Прафесар А. Шчапоццеў даводзіў, што “пакуль ён жывы, пераходзіць на беларускую мову ня будзе” [12, арк. 59].

Як адзначалася, сітуацыя на педагагічным факультэце БДУ, дзе канцэнтравалася большасць гуманітарыяў, адрознівалася ад агульнай, прычым адрознівалася на карысць беларусаў. У 1927/28 навучальным годзе сярод прафесараў іх было 24%, рускіх – 60%, яўрэяў – 8%; сярод дацэнтаў – адпаведна 44%, 22%, 31%; сярод асістэнтаў – 44%, 17%, 28% [13, арк. 38]. У архіўных матэрыялах сустракаецца таксама інфармацыя, некалькі адрозная ад прыведзенай вышэй. Паводле яе, нацыянальныя квоты былі прадстаўлены наступным чынам: сярод прафесараў – адпаведна 30%, 65% і 5%, сярод дацэнтаў – 53%, 20% і 27%, сярод асістэнтаў – 36%, 33% і 48% [14, арк. 13]. У чэрвені 1928 г. У. Пічэта ў дакладзе на Нацкамісіі ЦВК прадставіў яшчэ адзін варыянт, у якім прафесарская група размяркоўвалася па нацыянальнасцях наступным чынам: беларусы – 28,6%, руския – 61,9%, яўрэі – 4,7%; дацэнцкая – адпаведна 51,6%, 19,4%, 25,8%; асістэнцкая – 40,9%, 18,2%, 31,8%. Магчыма, разыходжанне абумоўлена тым, што прыведзены тут другі варыянт складаўся праз пару гадоў. Інфармацыя ж рэктара, думаецца, больш блізкая да рэальнага стану рэчаў. Адназначна спыніцца на якім-небудзь варыянце як адзіна правільным праблематычна. Тут толькі можна зрабіць выснову пра недасканаласць наяўнай базы даных. Тым не менш тры статыстычныя зводкі не супярэчаць адна адной у галоўным – усе яны дазваляюць убачыць агульную тэндэнцыю паступовага павелічэння выхадцаў з карэннага этнасу ў выкладчыцкім асяродку. Доказам служыць рост долі беларусаў ва ўсіх кваліфікацыйных групах да 1929/30 навучальнага года: прафесараў – да 38% і яўрэяў да 14% пры змяншэнні рускіх да 48%; дацэнтаў – да 54%, яўрэяў да 35% зноў жа пры змяншэнні рускіх да 11%; асістэнтаў – да 55% пры адначасовым памяншэнні долі яўрэяў і рускіх – адпаведна да 32% і 13% [15, арк. 24].

Адбылося так, відаць, таму, што універсітэт разглядаўся, ды і быў флагманам вышэйшай адукацыі, які прыцягваў да сябе пільную ўвагу кіраўніцтва рэспублікі (у тым ліку і Наркамата асветы), якое ў акрэсленыя гады асаблівае месца ў сваёй рабоце надавала рэалізацыі комплексу мер па беларусізацыі БССР. Не заставалася ў баку ад ажыццяўлення нацыянальнай палітыкі і праўленне універсітэта на чале з У. Пічэтам. Пэўным чынам характарызуе палітыку беларусізацыі ў навуковай галіне працэс каранізацыі кіраўніцтва ўстановы. На 1 красавіка 1924 г. у праўленні БДУ значылася 28,6% беларусаў, 42,9% яўрэяў і 21,4% рускіх. Прычым беларусы ў ім былі прадстаўленыя членам праўлення ад студэнтаў, галоўным бухгалтарам, кіраўніком спраў, загадчыкам адміністратыўна-гаспадарчай часткі [16, арк. 33]. Праз тры гады карціна істотна мяняецца. Беларусы цяпер займаюць 52,4% ад агульнай колькасці кіраўнічага складу універсітэта, яўрэі – 28,6%, руская – 4,8%. Пашырылася і змянілася кола пасад беларусаў: як і раней, прадстаўнік ад студэнтаў, член праўлення В. Друшчыц, кіраўнік спраў, ён жа сакратар Савета універсітэта, намеснік дэкана медфака, дэкан педфака і яго намеснік, загадчык беларускай доследна-паказальнай школы і інш. [17, арк. 59].

З канцэнтрацыяй гуманітарных спецыяльнасцяў на пачатку 1930-х гадоў у Мінскім вышэйшым педагагічным інстытуце размеркаванне навукова-педагагічных

работнікаў у ім на пачатку 1932/33 навучальнага года паводле, магчыма, няпоўных даных выглядала наступным чынам: беларусаў – 22 чалавекі (37,2%), яўрэяў – 21 (35,6%), рускіх – 8 (13,6%). Ніжэйпададзеная табліца дазваляе скласці комплекснае ўяўленне аб суадносінах нацыянальнага паходжання і кваліфікацыі супрацоўнікаў Мінскага педінстытута [18, арк. 21–22]:

Табліца 3 – Нацыянальнасць, кваліфікацыя, спецыялізацыя выкладчыкаў МВПІ

| Нацыянальнасць / Кваліфікацыя | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Іншыя | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Прафесары | 4–33,3% | 2–16,7% | 4–33,3% | 2–16,7% | 12–100% |
| у т.л. гуманітарыі | 3–37,5% | 1–12,5% | 2–25% | 2–25% | 8–100% |
| Дацэнты | 4–26,6% | 9–60% | 1–6,7% | 1–6,7% | 15–100% |
| у т.л. гуманітарыі | 1–25% | 3–75% | – | – | 4–100% |
| Асістэнты | 3–33,3% | 3–33,3% | 2–22,3% | 1–11,1% | 9–100% |
| у т.л. гуманітарыі | 1–25% | 2–50 | – | 1–25% | 4–100% |
| Выкладчыкі | 11–47,8% | 7–30,4% | 1–4,4% | 4–17,4% | 23–100% |
| у т.л. гуманітарыі | 7–50% | 4–28,6% | – | 3–21,4% | 14–100% |

У дадзеным выпадку пэўнае павелічэнне беларусаў сярод прафесараў тлумачыцца стварэннем МВПІ на базе педагагічнага факультэта БДУ, калі не ўсе былыя яго работнікі перайшлі на працу ў новую ўстанову. Трэба памятаць, што доля беларусаў паміж гуманітарыямі і ў 1920-х гадах была даволі заўважнай з прычыны акцэнтацыі адпаведнага кірунку даследаванняў у рэспубліцы. З 12 прафесараў, прозвішчы якіх утрымлівае “Тытульны спіс працаўнікоў і аспірантаў Вышэйшага Педінстытута ...”, сустракаем гісторыка У. Перцава, мова- і літаратуразнаўцаў М. Піятуховіча, П. Бузука, Я. Барычэўскага і інш. [18, арк. 21]. Няма, праўда, М. Нікольскага, які, відаць, у той час засяродзіўся на працы ў БелАН.

Яшчэ адзін педагагічны інстытут, дзе меліся ў той час гуманітарныя сацыяльна-гістарычнае і літаратурна-лінгвістычнае аддзяленні, – Магілёўскі, – па, магчыма, няпоўных даных 1932 г. (у спісе пазначаны выключна выкладчыкі гуманітарных і сацыяльных дысцыплін і два па вайсковай справе), таксама пацвярджае тэндэнцыі, выяўленыя Мінскім педінстытуце, а раней ва універсітэце, як у цэлым, так і па гуманітарыях у прыватнасці. Хоць, калі ўлічыць, што Я. Новік узгоднена з статінфармацыяй пісаў аб 16 выкладчыках у студзені 1931 г. [2, с. 113], можна дапусціць рост іх шэрагаў за год, у тагачасных варунках, да 23 чалавек.

Табліца 4 – Нацыянальнасць і кваліфікацыя выкладчыкаў МагПІ на 1 кастрычніка 1932 г.

| Нацыянальнасць/ кваліфікацыя | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Іншыя | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Дацэнты | 6 | 1 | – | – | 7 |
| Асістэнты | 7 | 4 | 1 | 1 | 13 |
| Выкладчыкі | 1 | – | 2 | – | 3 |
| Усяго | 14 | 5 | 3 | 1 | 23 |

Паводле прыведзеных даных, можа быць з прычыны асаблівасці складзенай інфармацыі, МагПІ вылучаецца з агульнага шэрагу ВНУ. Беларусы былі прадстаўленыя ў ім 60,9% ад колькасці навукова-педагагічных работнікаў, яўрэі – 21,7%, рускія –

толькі 13,1% і іншыя – 4,3%[1]. Можна меркаваць, абумоўлівалася гэта часам фарміравання ўстановы – 1930 г., калі з'яўляецца больш магчымасцяў забяспечваць штат уласнымі беларускімі, а не запрошанымі работнікамі, асабліва ў перыяд кампаніі па "разбуйненню" універсітэтаў і масавага стварэння вузка спецыялізаваных інстытутаў, тым больш стварэння іх на пустым месцы. Такое меркаванне пацвярджаецца тым, што з 23 улічаных выкладчыкаў толькі чатыры (17%) скончылі вышэйшыя навучальныя ўстановы да 1920 г. уключна, тры (13%) – да 1925 г. і 16 (70%) – у 1928–1932 гг. Думаецца, на такім становішчы адбіліся таксама горшыя ўмовы для навуковай працы і меншая прэстыжнасць за сталічныя ВНУ.

Камуністычны універсітэт Беларусі, які можна аднесці да гуманітарных, праіснаваў з 1925/26 да пачатку 1932/33 навучальнага года, калі быў пераўтвораны ў Вышэйшую камуністычную сельскагаспадарчую школу, у цэлым не пярэчыў адзначаным тэндэнцыям, паколькі пераважаная большасць яго выкладчыкаў працавала па сумяшчэнню, хоць удзельная вага беларусаў была некалькі большай, чым у БДУ: у другой палове 1920-х гадоў яны былі прадстаўлены 41,1%, яўрэі – 33,3%, рускія – 15,8%, іншыя – 9,8%.

Табліца 5 – Нацыянальнасць і кваліфікацыя выкладчыкаў КУБа на 1 красавіка 1926 г.[2]

| Нацыянальнасць/ кваліфікацыя | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Іншыя | Усяго |
|---|---|---|---|---|---|
| Кіраўнікі | 6–33,3% | 6–33,3% | 3–16,7% | 3–16,7% | 18–100% |
| Выкладчыкі | 11–45,8% | 6–25% | 5–20,8% | 2–8,4% | 24–100% |
| Асістэнты | 4–44,4% | 5–55,6% | – | – | 9–100% |
| Усяго | 21–41,2% | 17–33,3% | 8–15,8% | 5–9,7% | 51–100% |

Відавочна, беларусы не хацелі пакідаць па-за сваёй увагай камуністычную навучальную ўстанову, улічваючы магчымы ўплыў яе выпускнікоў, як будучых выкладчыкаў, партыйных і савецкіх кіраўнікоў, на ажыццяўленне практычных мерапрыемстваў па пабудове менавіта "беларускай Беларусі". Таму мы сустракаем у складзе выкладчыкаў вядомыя імёны дзеячаў беларускага руху (У. Ігнатоўскі, У. Чаржынскі, К. Міцкевіч, А. Бабарэка) альбо прыхільных яму В. Друшчыца і інш. Рускія ж праявілі менш зацікаўленасці да камВНУ таму, што тыя, хто першапачаткова прыехаў на працу ў БССР, уяўлялі сабой "класічных" навукоўцаў, якіх мала цікавіла выкладчыцкая дзейнасць, грунтаваная выключна на палітычных тэзісах. Адсюль – адсутнасць у спісе асабовага складу больш-менш вядомых вучоных рускага паходжання.

Падсумоўваючы прыведзеныя вышэй даныя, можна адзначыць, што сутнасныя зрухі колькасці прадстаўніцтва карэннага этнасу адбываюцца толькі на ніжэйшым узроўні – сярод асістэнтаў, дзе безумоўна пераважаюць беларусы. Тлумачыцца гэта больш актыўнай працай аспірантуры, якая стала рабіць свае першыя, пакуль нешматлікія, выпускі; тым, што асобы беларускага паходжання, якія працавалі за межамі Беларусі, не выказалі жадання пераязджаць сюды на сталую працу; слабай школьнай і універсітэцкай падрыхтоўкай беларусаў, якая не давала магчымасці масава

[1] Табліца складзена і падлікі зроблены па: [19, арк. 60–60 адв.]. Выданне, прысвечанае гісторыі Магілёўскага дзяржуніверсітэта, згадвае наяўнасць 43 выкладчыкаў у педінстытуце на 1932 г., а 23 – у 1937/38 навучальным годзе пры вызначаным штаце ў 57 асоб [20, с. 72, 74].

[2] Складзена па: [21, арк. 98–99 адв]. Пэўнае несупадзенне лічбаў з пададзенымі вышэй абумоўлена тым, што не ўлічаны адміністрацыйныя пасады, а толькі навукова-педагагічныя, адзін навуковы супрацоўнік, лабаранты. Кіраўнікоў у дадзеным выпадку можна прыраўняць да прафесараў.

прыцягнуць іх у вышэйшую школу і навуку. Да таго ж, кіраўніцтва ВНУ, у тым ліку БДУ, часам намагалася хутчэй даць званне дацэнта ці прафесара некаторым прыезджым, каб мацней звязаць іх з Беларуссю і яе культурай [11, арк. 124].

Вышэй мы ўжо адзначалі прыняцце і падтрымку беларусізацыі рэктарам універсітэта У. Пічэтам. Аналагічную пазіцыю займалі і некаторыя іншыя рускія прафесары, галоўным чынам гуманітарыі. Аб гэтым даволі канкрэтна гаворыцца ў інфармацыі, падрыхтаванай у сувязі з працай камісіі ЦК ВКП(б) на чале з У. Затонскім: "Выпадкі адкрытага супраціву акадэмічнаму росту партыйцаў і прасоўванню беларусаў ўжо рэдкія ў ВНУ. Нярэдка самі прафесары іх прасоўваюць. Некаторыя сталі выступаць за беларусізацыю: праф. Замоцін, Васкрасенскі, Пічэта з простых праціўнікаў беларусізацыі пераўтварыліся ў асобных выпадках у непасрэдных ініцыятараў і выразнікаў нацыяналістычных настрояў часткі беларускай інтэлігенцыі". Разам з тым пазней, у 1931 г., ім маглі прад'яўляць абсурдныя абвінавачванні: на прыкладзе А. Вазнясенскага ілюстравалі "стык вялікадзяржаўнага шавінізму з беларускім". Яму ставілі ў віну друкаванне твораў за мяжой. Але гэта была толькі частка віны. Другая – ў адказе прафесара на пытанне, чаму ён так рабіў: друкаваў па-англійску і па-нямецку, бо малы попыт на беларускамоўныя выданні, а не па-руску – каб нацыяналісты не залічылі яго ў шавіністы [12, арк. 59]. Камісія Затонскага адначасова адзначала варожасць да ўсяго беларускага з боку яўрэйскіх навуковых работнікаў – да каранізацыі навукоўцаў, незадаволенасць "недастатковым" камплектаваннем Акадэміі навук яўрэямі і г.д. [8, арк. 13–14].

Сапраўды, падобныя "крыўды", калі падыходзіць фармальна, мелі пад сабой грунт, але ж такіх масавых прэтэнзій, што пераўтвараліся ў пэўную з'яву, не было ў Расіі і Украіне. Магчыма, таму, што сітуацыя сама сабой урэгулявалася за папярэднія дзесяцігоддзі існавання там навуковых інстытутаў. Што да Акадэміі навук, то тут на самай справе пераважалі супрацоўнікі-беларусы. Але неабходна памятаць, што яшчэ 5–6 гадоў таму яўрэі не выявілі ніякай зацікаўленасці падчас запланаванага стварэння не толькі Інстытута беларускай культуры, але і асобнага Інстытута яўрэйскай культуры. Паводле справаздачы Інбелкульта за 1927 г., з ліку 176 адказаўшых на пытанні штатных работнікаў і сумяшчальнікаў 110 (63%) былі беларусамі, 31 (17,6%) – яўрэямі, 20 (11%) – палякамі [22, арк. 103]. У некаторай ступені карціна мяняецца, калі ўзяць толькі штатных супрацоўнікаў [23, арк. 199; 24, арк. 82]:

Табліца 6 – Нацыянальны склад штатных навуковых работнікаў БелАН

| Нац. / Год | Усяго чалавек | Беларусы | Яўрэі | Рускія | Палякі |
|---|---|---|---|---|---|
| 1928 г. | 81 | 70,4% | 12,3% | 8,6% | 3,7% |
| 1929 г. | 102 | 68,6% | 12,7% | 8,8% | 3,9% |

Сітуацыя рэзка мяняецца пасля правядзення кампаніі, звязанай з "раскрыццём" СВБ. А паколькі, па вызначэнні карных органаў, Беларуская акадэмія навук з'яўлялася "галоўным кублом СВБ", якраз па ёй і наносіўся галоўны ўдар. Ужо ў канцы 1931 г. нацыянальны склад яе навуковых кадраў выглядаў наступным чынам: беларусы – 49,3%, яўрэі – 25,3%, рускія – 12,9%, палякі – 4,6% [25, арк. 241]. Такім чынам выпраўляліся "хібы" ў нацыянальнай палітыцы, у тым ліку ў галіне кадраў навукі. У сувязі з яе новым паваротам гэта зразумела: нельга было дапусціць дамінавання беларусаў у вядучай навуковай установе, якая робіць значны ўплыў на культурнае жыццё і падрыхтоўку кадраў. Тым больш нельга было дапусціць уплыў праз яе такіх

вядомых людзей з незалежніцкімі поглядамі, як Я. Лёсік, А. і І. Цвікевічы, В. Ластоўскі, А. Смоліч, С. Некрашэвіч, Я. Каранеўскі, У. Ігнатоўскі і інш.

У выніку карэннай змены курса нацыянальнай палітыкі камуністычнай партыі, правядзення рэпрэсіўных кампаній 1930-х гадоў, дваццацігадовая праца па падрыхтоўцы нацыянальных навуковых кадраў, набыцця імі вышэйшай ступені навуковай кваліфікацыі ў сферы гуманітарных навук мела не вельмі вялікі плён. Прынамсі, вынікі былі не тыя, на якія разлічвалі ў 1920-я гады. Пацвярджаецца меркаванне хоць бы выбарамі ў АН БССР 1940 г. З усіх 108 прапанаваных кандыдатаў у правадзейныя члены і члены-карэспандэнты Акадэміі навук (па гуманітарных навуках балатавалася толькі 13 чалавек – 7 па гісторыі і 6 па літаратуры) беларусы былі прадстаўленыя 16 асобамі (14,8%), яўрэі – 18 (17,6%), рускія – 55 (50,9%). Вынікам выбараў стала тое, што з агульнага ліку 28 правадзейных членаў і 22 членаў-карэспандэнтаў жылі па-за межамі Беларусі і таму стала ў акадэміі не працавалі 33 чалавекі, у тым ліку 15 правадзейных членаў і 18 членаў-карэспандэнтаў [26, арк. 123].

Можна дадаць яшчэ адзін цікавы штрых, які характарызуе разгледжаны аспект нацыянальнай палітыкі. Гэта пастанова Прэзідыума Акадэміі навук БССР 1941 г., праз дваццаць гадоў пасля пачатку працы БДУ і Інбелкульта: “Слухалі: Аб пераходзе на беларускае справаводства. Пастанавілі: пытанне двойчы заслухоўвалася на Прэзідыуме, але перапіска вядзецца на рускай мове. Перапіска паміж інстытутамі, паміж Акадэміяй і іншымі ўстановамі павінна праводзіцца на беларускай мове. Абавязаць членаў Прэзідыума, дырэктараў інстытутаў і кіраўніцтва ўстаноў на працягу двух месяцаў вывучыць беларускую мову” [27, арк. 4].

У дадзеным катэксце думаецца, ёсць сэнс спыніцца на адным моманце, які мае гісторыка-навуковае значэнне. Звязаны ён з імем М. Пакроўскага, дакладней з крытыкай яго канцэптуальных падыходаў у асвятленні гісторыі Расіі. Гэта тым больш мае значэнне, што дадзеная асоба адыгрывала адну з відных роляў у справе ідэалагічнага забеспячэння ўмацавання савецкай улады. Да таго ж, ён займаў багата афіцыйных пасад: намеснік наркама асветы, кіраўнік Дзяржаўнага вучонага савета, Камакадэміі, ІЧП, Таварыства гісторыкаў-марксістаў, Цэнтрархіва, рэдакцый некалькіх часопісаў, экспертнай камісіі па прысуджэнні прэмій імя Леніна і г.д. Яшчэ напрыканцы жыцця М. Пакроўскага і асабліва пасля яго смерці ў 1932 г.[3] разгарнулася актыўная крытыка яго схематычных і фактычна нігілістычных падыходаў да асвятлення гістарычнага мінулага Расіі, што, праўда, было характэрна і для бальшавісцкага кіраўніцтва 1920-х гадоў. Але з пачатку 1930-х гадоў сітуацыя пачынае мяняцца. Тут выдзяляецца наступны аспект: тэрытарыяльная кантынентальная экспансія Расіі на ўсход, поўдзень і захад пачынае разглядацца як важны і станоўчы цывілізацыйны момант яе гісторыі і гісторыі аб’ектаў гэтай экспансіі. Такім чынам, адбываецца пераход ад прыніжэння ролі Расіі ў гістарычным працэсе да часам не абгрунтаванага яе ўзвышэння. Усё гэта відавочна суадносіцца са стаўкай на пабудову сацыялізму ў адной краіне.

Дадзены падыход вымушаў абраць цэнтр аб’яднання ідэалагічных высілкаў для дасягнення пастаўленых мэтаў. Натуральна, выбар быў зроблены на карысць РСФСР і ўласна Расіі, паколькі іншыя буйныя нацыянальныя гістарыяграфіі не маглі ўяўляць сабой дабратворнай аб’яднальнай глебы. Наадварот, праз сваю гісторыю, асабліва дачыненняў з Расіяй, яны аб’ектыўна супярэчылі намечаным планам, спрыяючы завяршэнню ўласных нацыятворчых працэсаў. У выніку, вонкава не мяняючы інтэрнацыяналісцкіх лозунгаў, вектар нацыянальнай палітыкі ўнутры СССР

[3] М.М. Пакроўскі памёр 10 красавіка, а 26 красавіка Прэзідыум БАН надаў яго імя Інстытуту гісторыі [28, с. 20].

скіроўваецца да фактычнай нацыянальнай уніфікацыі на расійскай аснове, асабліва ў дачыненні да славянскіх этнасаў – беларускага і ўкраінскага. Цяпер той самы вектар прымусілі змяніць свой напрамак на 180 градусаў. Беларуская гісторыя, стала тлумачыцца выключна гісторыяй Расіі пры акцэнтацыі бесканфліктнага гістарычнага суіснавання і пры дамінанце пастулата аб іманентным імкненні беларусаў да "ўз'яднання" з Расіяй. Зыходзячы са сказанага, выглядае лагічнай арганізацыя "цэнтрам" барацьбы з нацыянал-дэмакратызмам у пачатковых формах СВУ і СВБ, і недарма асноўны ўдар наносіўся па гуманітарыях, а сярод іх – па гісторыках. Такім чынам радыкальна мяняліся акцэнты ў комплексе гуманітарных навук, а значыць, павінны былі радыкальна мяняцца і гуманітарныя арыенціры грамадства. Мэта апраўдвала сродкі, мэта эканамічнага ўмацавання і тэрытарыяльнага пашырэння савецкай дзяржавы.

## СПІС ЛІТАРАТУРЫ

1. Михнюк, В. Н. Становление и развитие исторической науки Советской Белоруссии (1919–1941 гг.) / В. Н. Михнюк ; под ред П. Т. Петрикова. – Минск : Наука и техника, 1985. – 286 с.
2. Новик, Е. К. Формирование кадров народного образования Белоруссии (1917–1941 гг.) / Е. К. Новик ; науч. ред. П. Т. Петриков. – Минск : Наука и техника, 1981. – 295 с.
3. Корзенко, Г. В. Подготовка научных кадров в Беларуси. Взгляд сквозь годы / Г. В. Корзенко. – Минск : Хата, 1998. – 168 с.
4. Гісторыя Беларусі : у 6 т. / рэдкал. М. Касцюк (гал. рэд.) [і інш.]. – Мінск : Экаперспектыва, 2000–2006. – Т. 5 : Беларусь у 1917–1945 гг. / А. Вабішчэвіч [і інш.]. – 2006. – 613 с.
5. Даклад фракцыі праўленьня БДУ // Нацыянальны архіў Рэспублікі Беларусь (НАРБ). – Фонд 4. – Воп. 7. – Спр. 50. – Арк. 348.
6. Материалы о народном образовании БССР (22 декабря 1923 г.) // НАРБ. – Фонд 6. – Воп. 1. – Спр. 192. – Арк. 120–121.
7. Беларусізацыя ВНУ у 1925/26 г. // НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 1. – Спр. 386. – Арк. 104–110.
8. Кадры наши и враждебные среди работников научных учреждений и проявления шовинизма и национализма среди учащихся вузов, преподавателей и научных работников // НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 7. – Спр. 156. – Арк. 13–14.
9. Беларускі Дзяржаўны Універсітэт да 10-й гадавіны Кастрычнікавай рэвалюцыі. – Мінск, 1927. – 76 с.
10. Отчёт НКП за 1926/27 год // НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 316. – Арк. 4–89 адв.
11. Справаздача БДУ ад 21 чэрвеня 1928 г. // НАРБ. – Фонд 7. – Воп. 1. – Спр. 625. – Арк. 120–124.
12. Стэнаграма паседжаньня нацыянальнай камісіі пры ЦВК БССР 13 лютага 1931 г. // НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 104. – Арк. 59–61.
13. Научно-педагогические кадры. Педфак БГУ. (1927/28 уч. год) // НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 7. – Спр. 141. – Арк. 38–39.
14. Статыстычныя весткі [аб] навуковых працаўніках БДУ за 1927/28, 1928/29, 1929/30 вучэбныя гады // НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 1. – Спр. 417. – Арк. 13.
15. Даклад Пічэты 21 чэрвеня 1928 г. на Нацыянальнай Камісіі ЦВК // НАРБ. – Фонд 701. – Воп. 1. – Спр. 80. – Арк. 24–28.

16. Весткі аб нацыянальным складзе кіраўнічага складу Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту на 1-ае красавіка 1924 году // НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 1. – Спр. 210. – Арк. 33.

17. Весткі аб нацыянальным складзе кіраўнічага складу Беларускага Дзяржаўнага Унівэрсытэту на 1-ае жніўня 1926 году // НАРБ. – Фонд 205. – Воп. 1. – Спр. 210. – Арк. 59.

18. Тытульны сьпіс працаўнікоў і асьпірантаў Вышэйшага Педінстытута на 1. 10. 32 г. // НАРБ. – Фонд 31. – Воп. 1. – Спр. 1058. – Арк. 21–22.

19. Тытульны сьпіс навуковых працаўнікоў і асьпірантаў на 1-X-1932 г. Магілёўскага Пэдінстытута // НАРБ. – Фонд 31. – Воп. 1. – Спр. 1058. – Арк. 60–60 адв.

20. Магілёўскі дзяржаўны універсітэт імя А. Куляшова : мінулае і сучаснасць / А. Р. Агееў [і інш.] ; пад рэд. М. І. Вішнеўскага. – Магілёў : МДУ імя А. А. Куляшова, 2003. – 260 с.

21. Спіс асабовага складу працаўнікоў Камуністычнага Унівэрсытэту Беларусі імя Леніна па стану на 1/IV-26 г // НАРБ. – Фонд 101. – Воп. 1. – Спр. 2775. – Арк. 98–99 адв.

22. Справаздачы членаў ІБК за 1926/27 ак. год // ЦНА НАНБ. – Фонд 67. – Спр. 24. – Арк. 103–106.

23. Склад працаўнікоў ІБК, першая палова 1928 г. // ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 12. – Арк. 199–199 адв.

24. Навуковыя супрацоўнікі БАН (1929 г.) // НАРБ. – Фонд 42. – Воп. 1. – Спр. 1934. – Арк. 82.

25. Навуковыя сілы БАН па стану на 15 лістапада 1931 г. // ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 12. – Арк. 241.

26. Записка Народного комиссара финансов в ЦК и СНК (27 февраля 1941 г.) // НАРБ. – Фонд 4. – Воп. 21. – Спр. 2410. – Арк. 123.

27. Пратакол паседжання Прэзідыуму Акадэміі навук 8 лютага 1941 г. // ЦНА НАНБ. – Фонд 1. – Спр. 76. – Арк. 4.

28. Васілеўская, Н. Інстытут гісторыі Нацыянальнай Акадэміі навук Беларусі (1929–1945 гг.) : Летапіс важнейшых падзей / Н. Васілеўская, М. Токараў // БГЧ. – 2004. – № 10. – С. 19–22.

***Shauchuk I.*** **Characteristic of the scientist national composition (1920–1930s)**

The author undertakes an attempt to analyze the dynamics of changes in national composition in Belarus in the inter-war twenty-year period. This is realized on basis of the published researches and the archival materials. At that the attention is focused on the humanitarian scientists. The problem is considered in interrelation and correlation of sociopolitical and proper scientific one. At the same time there is emphasized the decisive role of the party and government decrease in regulation of the scientist national composition, its dependence on the change of party policy orientation in the socioeconomic sphere. In the first place this had an effect in particular on the representatives of the humanities.